І.М.Шаруха

# А.А.КАМІНСКІ – ГЕОГРАФ І КЛІМАТОЛАГ

Багатая Полацка-Віцебская зямля на людзей таленавітых, нястомных шукальнікаў і вынаходнікаў..."Бацька" рускай феналогіі Д.Кайгародаў, падарожнік А.Бяльніцкі-Біруля, заснавальнік айчыннай геамарфалогіі І.Чэрскі, "бацькі" палеанталогіі і эмбрыялогіі браты Кавалеўскія, гісторык А.Сахараў, геолаг А.Місуна... Віцебшчына радзіма А.А.Камінскага, славутага географа і кліматолага, віднага дзеяча расійскай навукі.

Нарадзіўся Антон Антонавіч Камінскі 5(17) лістапада 1862 года ў Себежскім павеце Віцебскай губерніі ў сям'і беларускага агранома.Застаўшыся сіратою, будучы вучоны вымушаны быў працаваць з 13 гадоў, каб неяк пракарміць сябе. Ужо тады яго адольвалі думкі аб вучобе... Але хутка бяжыць час... І вось ў 1882 годзе, нарэшце, ён заканчвае Мітаўскую гімназію і паступае ў Пецярбургскі універсітэт на фізіка-матэматычны факультэт. Пасля яго заканчэння Антон Камінскі працуе ў Галоўнай фізічнай (зараз Геафізічнай) абсерваторыі, дзе ў 1889 годзе становіцца на чале Расійскай метэаралагічнай сеткі. Гэтая праца, якую ён выконваў амаль 30 гадоў, спатрэбілася, калі Антон Антонавіч пісаў свае класічныя манаграфіі аб размеркаванні вільготнасці ў Расіі (1894), ціску і ветру ў СССР (1932, 1936).

Пад рэдакцыяй А.А.Камінскага было выдадзена 14 тамоў "Летапісу Геафізічнай абсерваторыі". Кожны, хто знаёміўся з гэтымі выданнямі, ведае, якая велізарная колькасць працы і ведаў укладзена ў гэтыя аб'ёмістыя кнігі. Атрымаўшы ў сваё падначаленне ў 1889 годзе 250 метэаралагічных станцый, Антон Антонавіч праз чвэрць стагоддзя давёў іх колькасць да тысячы.

У 1922 годзе ён абраны загадчыкам кліматалагічнага аддзялення (пазней кліматалагічны інстытут) абсерваторыі. А з 1983 года працуе ў абсерваторыі ў якасці кансультанта.

Вучань Ваейкава і Вільда Камінскі стварыў і сваю асабістую навуковую школу.

А.А.Камінскі быў вучоным з шырокім навуковым кругаглядам. Ён не замыкаўся ў коле адцягненых кліматалагічных пытанняў. Яго заўсёды цікавіла практычнае выкарыстанне кліматалогіі ў прыкладных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навуках, ці то народная і лясная гаспадарка, ахова здароўя, ці то тран спарт... У гэтым напрамку ім была праведзена велізарная работа.

Неабходна вызначыць працы Антона Антонавіча аб уплыве лес на клімат, сухавеі (напрыклад,“Тыпы засух і сухавеяў у СССР”,1934), а клімаце курортных месцаў. Акрамя кліматалогіі, А.А.Камінскі шмат працаваў і ў галіне гідралогіі: ён пісаў аб павадках у Ленінградзе, аб ледзяным покрыве Неўскай губы, аб хістаннях узроўню Каспійскага мора.

Антон Антонавіч быў адным з заснавальнікаў Гідралагічнага ін стытута і з 1920 года быў загадчыкам гідраграфічнага аддзела гэтай установы.

У навуковым асяроддзі Камінскага ведалі як добрага арганізата ра. У 1922 годзе па даручэнню Галоўнага Упраўлення марскога тран спарту Антон Антонавіч заснаваў Цэнтральнае гідраметэаралагічна бюро (ЦУМор) і да 1929 года узначальваў яго. За сем гадоў дзейнасц ЦУМора ён паспеў выпусціць у свет 9 тамоў “Паведамленняў бюро...” дзе змешчаны яго шматлікія працы. Сярод іх – “Аб напрамку ветра на Каспійскім моры”(1925), аб хістаннях узроўню Каспія (1923-1925) і ін шыя.

На працягу апошніх 30 гадоў жыцця А.А.Камінскі шмат часу ад даваў педагагічнай дзейнасці. Л.С.Берг прыцягнуў яго да чытання лек цый па кліматалогіі ў Геаграфічным інстытуце; з 1906 па 1913 год ён чытае лекцыі на Вышэйшых сельскагаспадарчых курсах, потым працуе прафесарам Сельскагаспадарчага інстытута, ЛДУ, ў Ленінградскім пединстытуце.

У Пецярбургскім ўніверсітэце Антон Антонавіч заснаваў кафед ру кліматалогіі і ўпершыню ў свеце ва універсітэце з’явілася спецыяль насць “кліматалогія”. У 1927 годзе першы ў свеце выпуск кліматолагаў пад кіраўніцтвам А.А.Камінскага паспяхова абараніў дыпломныя пра цы. Ва ўніверсітэце ён чытаў кліматалогію СССР, сельскагаспадарчую кліматалогію, методыку кліматалагічных работ.

А.А.Камінскі, хаця і быў кліматолагам, але быў адзіным пераем нікам Ваейкава на пасаду загадчыка кафедры метэаралогіі.

Камінскі быў значнай велічынёй не толькі у расійскай, але і у су светнай навуцы. У 1928 годзе славуты Фрыцьёф Нансен пісаў яму: “...дазваляю сабе прынесці Вам самыя сардэчныя віншаванні ва ўдзячным захапленні перад Вашымі выдатнымі і living рознабаковымі дасле даваннямі ва ўсіх галінах кліматалогіі. Гэтымі даследаваннямі Вы знач на пашырылі веды аб Зямлі...”.

Антон Антонавіч Камінскі быў сябрам (членам) Міжнароднай кліматалагічнай камісіі, Міжнароднай Асацыяцыі глебазнаўцаў. Сваімі працамі ён заваяваў павагу ў міжнародным навуковым асяроддзі. Не аднойчы буйныя метэаролагі і кліматолагі Еўропы і Амерыкі пісалі яму аб той павазе, якая замацавалася у сусвеце да “узорнай па сваёй даска

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наласці рускай метэаралогіі і кліматалогіі", да прац Галоўнай Геафізічнай абсерваторыі і яе лідэра А.А.Камінскага.

Актыўна працаваў прафесар Камінскі і ў Геаграфічным таварыстве, членам якога з'яўляўся з 1895 года. Антон Антонавіч Камінскі быў таксама абраны ганаровым членам Маскоўскага Метэаралагічнага таварыства і таварыства прыродазнаўцаў. Шмат сіл і энергіі аддаў вялікі вучоны і апрацоўкам кліматалагічных матэрыялаў экспедыцый Казлова, Толя і іншых.

З 1931 па 1935 год ён быў дырэктарам інстытута геаграфіі ГТ СССР. Застаючыся членам навукова-рэдакцыйнага камітэта, рэдагаваў Гідралагічныя даведнікі мораў СССР.

Галоўная праца прафесара А.Камінскага – аб "Гадавым ходзе і геаграфічным размеркаванні вільготнасці паветра ў Расіі" (1894), за якую яму была прысуджана Ламаносаўская прэмія. Гэта была цікавая і важная праца, якая вызначалася навізной прадмета, глыбінёй пранікнення ў сутнасць праблемы – адзінай ў сваім родзе.

За некаторыя свае працы А.А.Камінскі на выстаўцы "Руская Рыў'ера" атрымаў Залаты медаль, а прац у яго было больш двухсот.

Вялікую каштоўнасць прадстаўляюць яго карты размеркавання вільготнасці ў "Кліматычным атласе Расіі" (1900). Трэба вызначыць і такую цікавую працу як "Кліматычныя вобласці Усходняй Еўропы ў сувязі з размеркаваннем лясоў " (1924), дзе А.А.Камінскі паказаў, што звесткі аб гадавым ходзе вільготнасці паветра могуць быць з поспехам пакладзены ў аснову кліматычнага раянавання.

У апошнія гады жыцця А.Камінскі надрукаваў двухтомную працу "Ціск паветра і вецер у СССР" (з атласам, 1932-1936), якая мела сусветнае значэнне. Можна сказаць, што гэта плён усёй шматгадовай дзейнасці вялікага кліматолага.

Калі Камінскаму было далёка за семдзесят, ён надрукаваў свае важнейшыя працы. Былі ў яго і запланаваныя работы па пераносу вадзянога пару... Разам з Кененам і Рубінштэйнам Камінскі павінен быў падрыхтаваць выданне "Клімат СССР" з вялікай серыі "Klimatologie der Erde", але смерць, якая спасцігла вялікага дзеяча навукі 5 жніўня 1936 года, спыніла навуковыя даследаванні.

А.А.Камінскі быў далікатным, сціплым, чулым чалавекам, чалавекам, які заўсёды трымаў сваё слова. У навуковай дзейнасці быў няспешлівы, падоўгу выношваў свае ідэі і ўсе матэрыялы, якія выкарыстоўваў, падвяргаў грунтоўнай праверцы. Таму і вынікі, да якіх ён прыходзіў, даўгавечныя.

Антон Антонавіч Камінскі – наш зямляк, вялікі вучоны-кліматолаг жыва прымаў да сэрца інтарэсы кафедры, выкладанне дысцыплінаў і вучобу студэнтаў, і таму заслужыў вялікую павагу і любоў з боку прафесарскага саставу і шматлікага студэнцтва.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова